пісьменніка, вывучалі лабараторыю ягонага майстэрства, разбіраліся ў сакрэтах незвычайнай папулярнасці пісьменніка, але не зрабілі ніводнай спробы звязаць творчасць Пясецкага з усходнеславянскімі літаратурамі. Здаецца, неабходнасць такога падыходу ўжо відавочная.

[1] Piasecki S. Odpowiedz na pytania // Lwow i Wilnо. 1949. 19 czevwca.
[2] Kowalewski J. To moze ostatni romantyk // Tydzien Polski. 1964. 3 pazdzievnika
[3] Kowalewski J. To moze ostatni romantyk. Ibid.
[4] Piasecki S. Bogom nocy rowni. Gdansk, 1989. S. 25
[5] Ibid. S. 25.
[6] Ibld. S. 36.
[7] Piasecki S. Jabluszko. Wroclaw, 1990. S. 61.
[8] Piasecki S. Bogom nocy rowni. Gdansk, 1989. S. 61
[9] Ibid. S. 125.
[10] Piaseckl S. Odpowiedz na pytania ankiety // Wiadomosci. 1949. 1 maja.
[11] Ibid.
[12] ibid.
[13] Гл.: Polechowski K. Ksztalcilem sle z ksiag zecia: Szkic do biografli Sergiusza Piaseckiego // Odra. 1990. № 3.

*А.І. БЕЛЬСКІ*

## МАСТАЦКАЯ АНІМАЛІСТЫКА Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ (ДА ПРАБЛЕМЫ ВЫВУЧЭННЯ І ТЫПАЛОГІІ)

Сістэма вобразнага мыслення беларускай паэзіі – з'ява ўсеахопная і разгалінаваная. Даволі спецыфічным аб'ектам паэтычнага адлюстравання з'яўляюцца вобразы жывёл, што выклікае цікавасць да мастацкай анімалістыкі. Свет фауны ў беларускай паэзіі – гэта ў значнай ступені люстэрка духоўнасці асобы, яе ўвасабленне экалагічных поглядаў і маральна-гуманістычных перакананняў. Аднак анімалістычная тэматыка і звязаныя з ёй вобразы ды матывы на матэрыяле айчыннай літаратуры грунтоўна не разглядаліся, не вылучаліся як асобны надзвычай каштоўны кірунак даследавання. Адной з асноўных прычын гэтага можна лічыць развіццё беларускага літаратуразнаўства пераважна ў сацыялагічным, афіцыйна ангажаваным аспекце. Сёння літаратуразнаўцы найперш улічваюць спосабы і формы ўласна мастацкага ўвасаблення рэчаіснасці.

Традыцыі анімалізму ў літаратуры і мастацтве бяруць вытокі з міфалогіі і фальклору. Нашы продкі абагаўлялі і адухаўлялі жывёл, з якімі ў іх былі звязаны многія ўяўленні: жывыя істоты ўспрымаліся пачынальнікамі роду, атаясамліваліся з людзьмі, лічыліся прадвеснікамі нейкіх важных здарэнняў і падзей. Даследчык міфалогіі Т. Шамякіна ў гэтай сувязі піша: «У XX ст. звяроў называюць "малодшымі братамі" чалавека. Але старажытныя людзі лічылі жывёл не малодшымі, а старэйшымі сваімі братамі, больш таго – продкамі. Яны пастаянна шукалі аналогіі прыродных з'яў з сабою, шукалі першапрычыны ўсяго, у тым ліку саміх сябе. Паколькі звяры былі тады дужэйшыя і спрытнейшыя за людзей, апошнім, натуральна, хацелася быць на іх падобнымі»[1]. Пакланенне звярам і жывёлам (татэмізм і анімізм) даследчыкі адзначаюць у беларускай народнай абраднасці, казачным эпасе, байках, у літаратурных творах, асабліва тых, якія тычацца часоў дабіблейскай даўніны. Пра культ жывёл і іх адлюстраванне ў творчасці сведчаць наскальныя жывапіс, фігуркі звяроў, знойдзеныя пры раскопках. На палеалітычных помніках Францыі і Іспаніі, узрост якіх 40–50 тысяч гадоў, 80 % выяў складаюць вобразы дзікіх жывёл, і сярод іх – адбіткі коней, зуброў, аленяў. У старажытных кітайцаў адлік, рух часу атаясамліваўся з жывёламі, што і адлюстравана ў календары 12-гадовага жывёльнага цыкла, дзе анімалістычныя вобразы ўвасабляюць багаты семантычны змест: пэўная жывёла (мыш, карова, тыгр, заяц, конь, сабака, свіння і інш.) становіцца знакам-сімвалам і як бы прадвызначае гаспадарчую дзейнасць чалавека і яго быццё ўвогуле.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Персаніфікацыя і сакралізацыя жывёл у старажытнасці выявіла глыбокую духоўную повязь і гарманічныя стасункі чалавека з жывой прыродай.

Анімалістычная тэматыка ў сусветнай літаратуры набыла грунтоўную і шматаспектную распрацаванасць, складае цэлую мастацкую традыцыю. З найбольш вядомых пісьменнікаў-анімалістаў можна нагадаць Р. Кіплінга, Э. Сетан-Томпсана, Дж. Лондана, М. Прышвіна, В. Біянкі і інш. Надзвычай яркая з'ява мастацкай анімалістыкі – творы С. Ясеніна "Песнь о собаке", "Корова", "Лисица", якія ўражваюць эмацыянальна-псіхалагічнай глыбінёй паэтычнай вобразнасці: "Покатились глаза собачьи // Золотыми звездами в снег"[2] ("Песнь о собаке"). Матывы фауны займаюць значнае месца ў творчасці сучасных пісьменнікаў розных народаў: Дж. Адамсана, Х. Раса, Э. Казана, Ю. Рыхтэу, Ч. Айтматава і інш.

У беларускай літаратуры мастацкая анімалістыка таксама складае даволі прыкметны тэматычны пласт. У гэтай сувязі згадваецца нямала імёнаў[3]. Сучасны празаік І. Пташнікаў – аўтар твораў "Алені", "Арчыбал", "Львы", "Пагоня". У апавяданні "Львы" глыбока перададзены пакуты ад радыяцыі сабакі Д'жукі. Пісьменнік умее чуйна, праніклівa перадаваць перажыванні жывой істоты, якая трапіла ў трагічнае становішча, і гэта збліжае яго з такімі сучаснымі празаікамі-анімалістамі, як англічанін Р. Эдамс, які напісаў раман "Чумныя сабакі", рускія мастакі слова Г. Траяпольскі, пяру якога належыць вядомая аповесць "Белы Бім Чорнае Вуха", В. Бялоў, аўтар цікавага зборніка "Апавяданні пра ўсякую жыўнасць". Чарнобыль прымусіў людзей пакінуць радзіму. Трагізм гэтага вымушанага расстання раскрыты ў эпізодзе, калі малады гаспадар развітваецца з сабакам Д'жукі: "Перад тым гаспадар пусціў яго ў хату і доўга гладзіў па галаве, гледзячы ў вочы. Пасля сам лізнуў яго, Д'жукі, у нос і заплакаў"[4]. Д'жукі паўстае з твора як істота з адкрытай і відушчай душой, якой вельмі цяжка, балюча, трывожна.

Апавяданне І. Пташнікава пераканаўча сведчыць аб анімалізме як форме чалавечай свядомасці і культуры – адной з неад'емных і арыгінальных тэндэнцый сучаснай беларускай літаратуры. "Падобна да таго, як самавызначэнне асобы немагчыма без адносін яе да другой асобы, так і самавызначэнне ўсяго чалавечага роду не можа адбывацца без яго адносін да жывёльнага свету", – разважае літаратуразнаўца М. Эпштэйн, справядліва зазначаючы далей наступнае: "Жывёлы – балючае сумленне чалавецтва, адчувальнасць якога завастраецца па меры нашага нарастаючага самасцвярджэння над прыродай. І калі заацэнтрызм ёсць гістарычна зжытая, пройдзеная стадыя культураўтварэння, то *анімалізму* належыць узрастаючая роля ў наладжванні перадумоў будучай, экалагічна збалансаванай культуры, якая пераадолее згубную аднабаковасць антрапамарфізму"[5].

Паэзія, можа, як ніякі іншы від мастацтва яскрава раскрывае змест і культуру адносін чалавека да іншых жывых істот, яна – і гэта звяртае ўвагу асабліва – выпрацавала экалагічна выверaную сістэму анімалістычных поглядаў. Зразумела, што з цягам часу шмат чаго перайначылася ў стаўленні грамадства да прыроды, у тым ліку да свету фауны (страчана мера разумнасці, перамагае бяздушны, ваяўнічы утылітарызм, пануе браканьерства, варварства і г. д.), але менавіта паэты ў спажывецка-тэхнакратычным XX ст. выступалі захавальнікамі адвечных асноў быцця, абаронцамі гармоніі паміж чалавекам і ўсім жывым на зямлі. Сведчаннем глыбока духоўнага і гуманістычнага светапогляду з'яўляюцца анімалістычныя творы двух нашых сучаснікаў – беларускага паэта Я. Сіпакова і рускага паэта беларускіх каранёў І. Шклярэўскага.

У творчасці гэтых пісьменнікаў (якія, дарэчы, па сваім узросце равеснікі) прырода – адзін з пастаянных аб'ектаў мастацкага адлюстравання, а дакладней, галоўная тэма душы. Іх пейзажную творчасць збліжае праніклёны лірызм, жывапісная пластыка слова, разважлівы лад паэтычнай мовы. Све-



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

тапоглядная пераклічка, падабенства выяўленчай манеры назіраецца і пры звароце паэтаў да ўвасаблення анімалістычных вобразаў.

Спагада, спачуванне жывым істотам – вось аснова паэтычнага анімалізму Я. Сіпакова і І. Шклярэўскага. У вершах "Ваўчыца ў звярынцы" і "Пока в стоповке жадно ест собачник..." матыў страты волі жывёламі набывае драматычнае гучанне. Калі ваўчыца ці сабака пакутуюць ад несвабоды, то што ж тады казаць пра нас, людзей. Тут, між іншым, згадваецца Багушэвічаў Аліндарка, які, трапіўшы ў астрог, кажа, што "...ужо ж скаціна тая // Або гадзіна праклята // І та цану волі знае..."[6]. Так, здаецца, ваўчыца – драпежнік, небяспечная ў прыродзе істота, але яна не паўстае перад намі як сімвал нейкай агрэсіі, а як ахвяра. Ваўчыца-маці тужыць, пакутуе, і на яе боль, трывогу паэтава сэрца адгукаецца шчыра і чуйна, успрымае гэтую няволю як цяжкі прысуд:

Кранаў за сэрца голас яе слабы,
Хоць ён і з пашчы воўчае выходзіў.
Яна ж праз краты высунула лапы –
Хай хоць яны пабудуць на свабодзе[7].

На волю просіцца воўк у вершы Я. Сіпакова "Скарга прыручанага ваўка". Гэты маналог успрымаецца і алегарычна, як, скажам, і "Маналог вавёркі" Я. Янішчыц. Нярэдка чалавека таксама прыручаюць, паднявольваюць, ён робіцца заложнікам пэўных абставін. Лёсы чалавека і прадстаўнікоў жывёльнага свету бываюць падобныя між сабой і нават аднолькавыя.

У згаданым вышэй творы І. Шклярэўскага "Пока в столовке жадно ест собачник..." нявольнікі – сабакі, якіх чакае смерць. Калі дзіцячае сэрца непасрэдна і эмацыянальна ўспрымае рэчаіснасць, то тады яно асабліва востра рэагуе на бяду звяроў ды жывёл. Таму хлопчык, герой твора, ратуе зняволеных жывёл ад сабакара, а ўчынак гэты, безумоўна, – вынік спачування, пратэсту супраць гвалту. У вершы паэтызуюцца ўцёкі ахвяр расправы, услаўляюцца салідарнасць, братняя еднасць з гэтымі чатырохногімі істотамі, якія, як і людзі, радуюцца свабодзе:

Их колет рожь! Их радуют проклятья!
Под каждым стогом есть для них приют.
Но и во сне, обнявшись, словно братья,
они бегут, бегут, бегут, бегут...[8]

Паўтор дзеяслова "бегут" і шматкроп'е ў канцы твора перадаюць супольны рух чалавека і жывёл, скіраваны, як падаецца, у будучыню.

У І. Шкпярэўскага ўлюбёны анімалістычны вобраз – вобраз сабакі. Уражвае і запамінаецца фотаздымак у пачатку зборніка "Красная Книга" (1986): аўчарка ляжыць на каленях паэта, яго падбародак пяшчотна прыткнуўся да галавы свайго добрага, адданага сябра, на нас пазіраюць задумлівыя вочы чалавека і сабакі. Паэт, які пароднены са светам прыроды, выступае ў гэтай вершаванай кнізе як прапаведнік свабоды і гуманізму ў адносінах да жывёл і ў гэтым плане ён працягвае традыцыі рускай паэзіі (С. Ясенін, М. Клюеў, М. Забалоцкі і інш.), якая бараніла жыццё і правы чатырохногіх братоў чалавека.

У І. Шклярэўскага ёсць такія радкі пра сабаку: "...люблю твою морду волчью...". Сабака для яго – родная і дарагая істота: "Собака родная моя! // Хорошо нам вдвоем в темноте // Молча лежать у огня // на забытой полесской версте"[9] ("Собака моя родная!.."). У хвіліны смутку ад прысутнасці сабакі паэт зведвае прыліў душэўнага цяпла, ён здольны адчуць у жывой істоце самога сябе:

Вот я собаку обнимаю.
Так на меня она глядит,
что вот сейчас — заговорит!
А я завою и залаю...[10]

*("Когда ночной костер гудит...")*



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

Сіпакоўскі татэм, калі можна так сказаць, – конь. Пра гэта сведчыць шэраг твораў, у якіх яго вобраз набывае глыбокую сэнсава-змястоўную трактоўку. Зрэшты, у сістэме анімалістычных вобразаў беларускай паэзіі конь – галоўны персанаж. У частотна-тэматычным паказальніку, складзеным намі, зафіксавана больш 70-ці твораў пра каня. У паэзіі Я. Сіпакова вобраз гэтай жывёлы займае ключавое месца.

Найперш конь асацыіруецца ў яго з вёскай, родным з дзяцінства ўлоннем і побытам. Невыпадкова так радуецца герой верша "Коні на праспекце" гэтым істотам, якія ў горадзе – сапраўднае дзіва: "Сам бы, здаецца, пабег пад музыку конскага цокату..." (41). Конь як увасабленне вольнага лёту паэтызуецца ў вершы "Хаця ў аснежаных залужжах...". Іначшыя адносіны выклікае ў паэта спутаная і зацугляная жывёліна. Жаль, шкадаванне – пачуцці, якія выказаны ў вершы "Ах, мілы конь, ах, мілы косю...". Паэт просіць у яго прабачання "за даўні здзек". Сучаснасць выцесніла каня з рэчаіснасці, ён "ужо госць у нас". І таму яшчэ ў 70-я гады паэт жадаў, каб дружба чалавека з канём працягвалася, каб у іх не было адзін на аднаго крыўды. У XX ст. адносіны чалавека і жывёл аказаліся далёкія ад ідэальных.

Некалі лёс селяніна-беларуса і каня складаў адно цэлае, без гэтага памочніка нельга было ўявіць гаспадаранне на зямлі. У "Элегіі" паэт згадвае свайго бацьку, які "заўсёды быў зросшыся з канём", малюе іх супольную цяжкую працу, паказвае агульную долю. У гэтым працоўным дбанні існавала свая паэзія: "І жаўруковая песня ім на спіны // Падала і разбіваліся – званочкі // Скочваліся, быццам пацеркі, у барозны...(193).

Сын не заручыў сваю долю з канём і працай на зямлі, і таму гучаць у "Элегіі" і вершы "Конь, сівы ад гадоў..." матывы віны і суму: "Што я здрадзіў табе // Ты даруй мне, прабач..." (197). І гэтая віна, настальгія, просьба аб дараванні ўспрымаюцца як асабістая балючая далучанасць да драмы беларускай вёскі – страты гаспадара, абрыву сувязяў чалавека са спрадвечным укладам народнага жыцця. Конь жа быў адной з апор і цэнтраў сялянскага сусвету.

У паэзіі Я. Сіпакова і І. Шклярэўскага, здавалася б, выяўляецца прыхільнасць да розных анімалістычных вобразаў. Між тым конь і сабака адносяцца да прыхатніх жывёл, якія, узятыя разам, трывала звязаны сваім функцыянальным прызначэннем – знаходзіцца побач і разам з чалавекам, яны блізкія сваёй сутнасцю – верныя і адданыя сябры. Сабака ў Шклярэўскага і конь у Сіпакова набываюць разнапланавае ўвасабленне, але характарызуюцца станоўча. У абодвух аўтараў выяўляецца гуманістычная канцэпцыя жывёльнага свету, культывуюцца такія пачуцці, як любоў, шкадаванне, міласэрнасць, чуласць, дабрыня, маральная чысціня адносін да жывых істот. Паэты ўдзячныя жывёлам за іх цеплыню роднасці, дружалюбнасць, саўдзел у душэўным жыцці і лёсе. Гвалт і садызм у дачыненні да жывых стварэнняў прыроды перайначваюць самаго чалавека і свет наогул, і гэта добра адчуваюць нашы сучасныя паэты. Воля і свабода жывёл – прызнанне іх значнасці, паэтызацыя іх душы, здольнай радавацца і пакутаваць – гэтыя матывы гучаць у сучаснай літаратуры пра фауну. Анімалістычныя старонкі творчасці Я. Сіпакова і І. Шкпярэўскага асабліва прапаведуюць ідэю гарманічна-суладнага, духоўна-экалагічнага развіцця адносін чалавека да ўсяго жывога на зямлі.

[1] Шамякіна Т. Міфалогія: Вытокі нашай самасвядомасці // Роднае слова. 1993. № 8. С. 60.

[2] Есенин С. Стихотворения; Поэмы. М., 1985. С. 71

[3] Гл.: Бельскі А. Свет ад травы да зор: Беларуская паэзія: сістэма вобразаў прыроды, паэтыка пейзажу. Мн., 1998. С. 208–211.

[4] Пташнікаў І. Львы: Апавяданні. Мн., 1991. С. 90.

[5] Эпштейн М.Н. Природа, мир, тайник вселенной...: Система пейзажных образов в русской поэзии. М., 1990. С. 88–89.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

[6] Багушэвіч Ф. Кепска будзе! // Беларуская літаратура XIX стагоддзя: Хрэстаматыя / Склад. А.А. Лойка, В.П. Рагойша. Мн., 1988. С. 275.
[7] Сіпакоў Я. Выбраныя творы: У 2 т. Мн., 1995. Т. 1. С. 12. Далей цытаты падаюцца па гэтым выданні з пазначэннем адпаведнай старонкі ў дужках.
[8] Шкляревский И. Красная Книга: Стихотворения и поэмы. М., 1986. С. 131.
[9] Там жа. С. 58.
[10] Там жа. С. 117.

*У.Ю. ВЕРЫНА*

## ЭВАЛЮЦЫЯ ПАЭТЫЧНАЙ СІСТЭМЫ А. РАЗАНАВА

Эксперыментальная паэзія А. Разанава паслужыла ўзорам для многіх маладых паэтаў канца 80–90-х гадоў, і сёння пачаткоўцы часта з першых публікацый прапануюць авангардную паэзію. Наватарства А. Разанава пераўтварылася ў традыцыю і мае сёння вялікую колькасць наступнікаў.

Нельга сказаць, што А. Разанаў пачынаў «з нуля» – філасофія, увасобленая ў верлібры, ужо ўвайшла ў беларускую літаратуру з паэзіяй М. Танка, і А. Разанаў наследуе спосаб кампазіцыйнага разгортвання верша ў кірунку да філасофскага абагульнення, спосаб метафарызацыі (элементы матэрыяльнага свету набываюць філасофскі змест і яднаюцца незвычайнай метафарай), характар вобразнасці (апора на асацыяцыю). Але разам з тым наватарскія пошукі паэта закранулі і фармальную структуру верша, і канцэпцыю асобы, і мастацкі змест – усе ўзроўні паэтычнага тэксту. Такім чынам, аўтар абраў самы плённы шлях наватарства – адначасова і радыкальны, і з'яднаны з традыцыяй.

Паэтычная сістэма А. Разанава канчаткова афармілася ў 90-я гады, прайшоўшы праз тры асноўныя этапы: традыцыя – пераходны этап – «чысты» эксперымент, што добра ілюстрыруецца змяненнем метрычнага рэпертуару паэта. Першы зборнік – «Адраджэнне» (1970) – цалкам складаецца з рыфмаваных сілаба-танічных вершаў. Наступны – «Назаўжды» (1974) – змяшчае рыфмаваныя сілаба-танічныя вершы; пункціры, напісаныя часткова верлібрам, у большасці – метрычным рыфмаваным вершам; паэму, якая ўяўляе сабой мантажную пабудову (у межах тэксту злучаюцца рыфмаваныя сілаба-танічныя радкі і проза).

Другі, пераходны этап у творчасці А. Разанава, на нашу думку, пачынаецца са зборніка «Каардынаты быцця» (1976), дзе рэпрэзентаваны сем варыянтаў рытмічнай структурацыі тэксту. З трынаццаці паэм зборніка тры напісаны рыфмаваным сілаба-танічным вершам, дзве – верлібрам з метрычнай дамінантай, дзве – прозай, адна – бязрыфменным дольнікам, адна – «чыстым» верлібрам. Такім чынам, тут прысутнічае амаль увесь спектр формаў, пераходных ад традыцыйнага верша да прозы.

У наступным зборніку – «Шлях-360» (1981) – сітуацыя крыху змяняецца за кошт мініяцюр: вершы і квантэмы цалкам напісаны верлібрам. Зборнік мае своеасаблівую структуру: у ім дзевяць раздзелаў, і кожны з іх складае паэма, два вершы і дзве квантэмы. З дзевяці паэм тры напісаны рыфмаваным сілаба-танічным вершам, дзве – бязрыфменным сілаба-танічным, дзве празаічныя, адна напісана верлібрам з метрычнай дамінантай, адна – «чыстым» свабодным вершам.

Трэці, уласна эксперыментатарскі этап пачынаецца са зборніка «Вастрыё стралы» (1988) і працягваецца да апошняга часу, уключаючы зборнікі «У горадзе валадарыць Рагвалод» (1992), «Паляванне ў райскай даліне» (1995), «Рэчаіснасць» (1998). Усе творы гэтага перыяду складаюць верлібры і версэты. Выключэннем з'яўляюцца паэмы са зборніка «Паляванне» – рыфмаваныя сілаба-танічныя.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm